## Война 'антыпартыйным хістаньням у камсамоле.

# За шкодніцтва—вон з камсамолу.

### Ці толькі перагнуў.

На сходзе камсамольскай ячэйкі Правгасу 15/II—30 г. Пярлоў, выступаючы у спрэчках па дакладу аб працы студэнцтва у час зімовых вакацый, высунуў свае погляды на становішча клясавай барацьбы ў вёсцы. „Кулак—слабая сацыяльная сіла. У нас дыктатура пралетарыяту, пагэтаму нельга гаварыць аб зажыме кулаком сераднякаў і беднякоў“.

Толькі ў чацьвертым сваім выступленьні, пасьля дадзенага камсамольцамі рашучага адпору, тав. Пярлоў заявіў: „У пылу спрэчак я перагнуў палку“ і прывёў такі аргумант: „Тое, што ў час трацкісцкай апазыцыі ў мяне былі хістаньні можа даказаць, што я не магу быць правым ухілістым“.

Сход асудзіў выступленьне Пярлова, як замазваючае абвастрэньне клясавай барацьбы на вёсцы і адбіваючае думкі правых ухілістых.

**В. П.**

### Дарашэвіч і Бягун ашукалі ЦРК.

Нармаваньне водпуску прадуктау сустракаецца з імкненьнем часткі пайнікаў ЦРК шляхам падчыстак, перадачы кніжак і г. д. абыйсьці існуючыя нормы. Павінен прыцягнуць да сябе ўвагу факт далучэньня да гэтага дробна-буржуазнага фронту 2-х камсамольцаў-студэнтаў.

На працягу доўгага часу камсамолец Дарашэвіч атрымоўваў з ЦРК нармаваныя прадукты ў падвойным памеры: для сябе і на ўнесеную ім у заборную кніжку жонку брата, якая адначасова лічылася і ў кніжцы брата Дарашэвіча.

Іншым шляхам пашоў студэнт Бягун. Ён перадаваў сваю заборную кніжку ўсім жадаючым. У выніку ў затрыманай кніжцы аказалася прыпісаным якім-та з таварышоў Бягуна 2 р. паявога ўносу.

Ячэйка ЛКСМ Рабфаку выключыла Дарашэвіча з камсамолу і вынесла Бягуну вымову.

**В. А.**

## Шчырае прызнаньне тав. Грачыхі.

Напэўна Вы зьдзіўлены раптоўнаму „прызнаньню“ сваіх ідэалёгічных памылак інспэктарам НКФБ і выкладчыкам прамых падаткаў на 4-м курсе Эканамічнага Аддзяленьня Правгасу тав. Грачыха?.

Вы памыляецеся.

„Столькі памылак, столькі недарэчнасьцяў. Проста парушэньне рэвалюцыйнай законнасьці ў падатковай палітыцы; і на вошто ўсё гэта?“. Так ацэньвае Грачыха налёт менскіх рабочых брыгад на прыватна-капіталістычныя элемэнты гораду, на злосных недаімшчыкаў падатку, які быў зроблены ў канцы мінулага году, каб узыскаць з нэпманаў 800.000 недаімак.

„Вось Вам прыклад—працягвае ён навучаць студэнтаў—чалавек павінен быў унесьці 246 р. падатку, але раптоўна налятае рабочая брыгада і забірае грошы 5.000 руб., аблігацый на 10.000 рубл. і мануфактуры на 25.000 руб. Хіба-ж гэта парадак? Падумайце толькі за 246 руб.?“.

Вось шчырае прызнаньне Грачыхі на карысьць прыватна-капіталістычных элемэнтаў. Студэнцтва правільна ацаніла выступленьне Грачыхі, як чарговую вылазку супроць падатковай палітыкі партыі.

А як з боку выкладчыка—гэта ёсьць праяўленьне ворожай ідэалёгіі ў забарону нэпманскіх элемэнтаў з боку тав. Грачыхі—дадамо мы.

**Лушчыцкі.**

## Трыбуна страціла першае месца.

У цёмным калідоры старога Пэдфакаўскага будынку пад заседжанай мухамі і зацягнутай павуціньнем лямпачкай вісяць і чуць хістаюцца абадраныя „калёнкі“. Гэта 3-ці (за $4^1/_2$ месяцы) нумар насьценгазэты „Трыбуна“ воргану студэнцтва Правгасу.

Няма зараз таго натоўпу студэнцтва, які запруджваў у мінулым годзе месца каля яе кожныя 10—15 дзён, Атрыманы на Ўсебеларускай выстаўцы ганаровы ліст, які замацоўваў за газэтай першае месца, ляжыць на дне скрыні бюро партыйнай ячэйкі.

У чым прычына гэтага заняпаду? Чаму няма працы з студкорамі, аб якой былі такія ружовыя мары ў працаўнікоў рэдкалегіі ў пачатку году?

Таму, што частка рэдакцыі зусім адарвана ад жыцьця факультэту; таму, што ні партыйная ячэйка, ні іншыя арганізацыі не адклікаюцца на тыя „самакрытычныя“ артыкулы, якія калі-небудзь мільгацяць на старонках „Трыбуны“.

Студкоры, ня маючы вынікаў сваіх „з больлю сэрца“ напісаных артыкулаў, не паддаюцца ніякай агітацыі, на сходы студкораў ня ідуць і ў газэту ня пішуць.

**Правгасавец.**

## Пэдфакаўцы падцягніцеся. Пастаўце працу ячэйкі Мопр на належную вышыню.

Праца Мопраўскай ячэйкі Пэдфаку адчуваецца слаба. Аб ёй напамінае толькі насьценгазэта Моправец і выхад часопісу „Путь МОПР‘а“, які распаўсюджваецца ўпаўнаважанымі па МОПР‘у. Працуе толькі актыў. Аднак і пры гэтым маюцца некаторыя дасягненьні. Так на карысьць МОПР студэнцтва Пэдфаку зрабіла падпіску яшчэ да пачатку навучальнага году на 30 р. Разгэрнута была зімовая дапамога палітзьняволеным і іх сем‘ям, сабрана сродкаў каля 400 р. у той час, калі Райком МОПР даў заданьне ў 100 р.

Наша ячэйка шэфствуе над 3-мя мопраўскімі ячэйкамі вёскі, якім аказваецца дапамога ў працы, робяцца выезды з пастаноўкай адпаведных дакладаў, аказана дапамога ў выпісцы мопраўскай літаратуры.

Работу можна было-б разгарнуць і шырэй пры большай актыўнасьці студэнцтва і прафарганізацый, бо да гэтуль студэнцтва і Прафком мала цікавіліся гэтай працай.

**Шчуцкі.**

## ЧАМУ НЯ ЗЬБІРАЕЦЦА ПОПЕЛ!?

Пра тое, якую карысьць дае попел, гаварыць ня трэба.

Тымчасам пытаньне зьбіраньня попелу ў нас стаіць зусім кепска. Кожны дзень, гэтае ўгнаеньне, якое павялічвае ўраджайнасьць выкідваецца ў памыйныя ямы.

Пасьля масавага паходу камсамольцаў за попелам сыстэматычным зьбіраньнем яго амаль ніхто больш ня цікавіўся.

У нас амаль дзьве тысячы студэнтаў БДУ жыве на прыватных кватэрах. Калі кожны з іх арганізуе збор попелу на сваім двары, мы будзем мець дзесяткі тысяч пудоў попелу.

Прафарганізацыі павінны наладзіць гэтую справу.

**Вінаградаў.**

## „Калектывізацыя“ па шастакоўскі.

У час вакацыі камэндант тав. Шастакоўскі надумаўся ажыцьцявіць ідэі калектывізацыі ў інтэрнаце па Рэвалюцыйнай. Зараз-жа ён прыслаў сталяроў разбурыць паміж пакоямі 11—13 сьценкі і тым павялічыць жыл. плошчу. Студэнты катэгарычна запратэставалі. Тав. Шастакоўскі не здаваўся. Прышлося схадзіць у Праўленьне, каб прымусіць Шастакоўскага адмовіцца ад выкананьня сваіх ідэй. Адрэмантаваць-жа кіпяцільнік, які стаіць няпрыгодным некалькі тыдняў, тав. Шастакоўскі так і ня думае. А студэнты інтэрнату і пасьля вакацый асталіся бяз вару.

**М. Р.**

## ХРОНІКА.

✱ У лазьні па Ляхаўцы студэнтам даюцца ільготныя білеты па чацьвяргох і пятніцах.

Выканбюро ўзьняла пытаньне перад Гарсаветам аб атрыманьні ільгот і ў гарадзкую лазьню.

# ПЛЯН

## Працы Бюро Калектыву КП(б)Б БДУ на тэрмі[н] 1-ае красавіка 1930 г.

| №№ п/п. | Зьмест працы (пытаньняў) | Хто падрыхтоўвае | Час | Дзе заслухоўваецца |
|---|---|---|---|---|
| | **А. Арганізацыйна-партпраца.** | | | |
| 1 | Аб ходзе падпіскі на 3-ую пазыку індустрыялізацыі. | Хурсік | | Бюро |
| 2 | Аб рэарганізацыі структуры партарганізацый БДУ. | Эпштэйн | Студз. Люты | „ Сход |
| 3 | Праверка выканьня пастаноў і вынікаў камісіі па частцы па асобных факультэтах. | Камісія Эпштэйн | Сакав. | Бюро |
| 4 | Пытаньні і плян перавыбараў куроргаў Бюро ячэек і Бюро калект. | Факульт. ячэйкі Эпштэйн | „ | Бюро і сходы |
| 5 | Аб рэарган. партпрацы па калектыву КП(б)Б БДУ. | Камісія | „ | Бюро |
| | **Б. Агітацыйна-прапагандысцкая праца.** | | | |
| 1 | Аб становішча Шэфпрацы . . . . | АПА | Сьн. | „ |
| 2 | Аб складзе рэдкалегіі друкаванай газэты | „ | „ | „ |
| 3 | Аб пасеўнай кампаніі і ўдзелу ў ёй студэнцтва. | „ | Студз. | „ |
| 4 | Вынікі ўдзелу студэнцтва ў правядзеньні пасеўнай кампаніі і калектывізацыі вескі. | „ | Люты | „ |
| 5 | Плян правядзеньня 3-х месячніка бел.-пралетарскай і нацменаўскай культуры. | „ | „ | „ |
| 6 | Вынікі перавыбараў рэдкалегій нас. газэт. | Нарада фракцыі рэдкал. АПА | „ | „ |
| 7 | Вынікі партыйна-палітычнай і камсамольскай асьветы за першае паўгодзьдзе 29/30 нав. году (нарада апоргаў яч.). | АПА | Люты | Бюро |
| 8 | Аб пашырэньні сеткі курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ і Рабфакі і выніку камплектаваньня слухачамі. | Фракцыя Выканбюро | „ | „ |
| 9 | Вынікі ўдзелу студэнцтва ў 3-х месячніку беларускай і нацменаўскай культуры. | Бюро калект. ЛКСМБ | „ | „ |
| 10 | Удзел студэнцтва ў правядзеньні справаздачнай кампаніі с/саветаў. | Фракцыя Выканбюро | „ | „ |
| 11 | Становішча шэфпрацы ў новых падшэфных с/саветах. | Фракцыя МК і ВК і шэфства | „ | „ |
| 12 | Даклад яч. Асо-Авіяхіму . . . . . | т. Сыманенка | „ | „ |
| 13 | Даклад працы рэдкалегіі газэты „Ленінскім Шляхам“. | т. Маліноўскі | Сакав. | „ |
| 14 | Сатановішча сатаварыства з Чырвонай арміяй. | Фракцыя ВБ | „ | „ |
| 15 | Становішча фізкультуры ў БДУ . . | Фракцыя ВБ і Бюро кал. ЛКСМБ | „ | „ |
| 16 | Падрыхтоўчая праца да летніх вакацый і ўдзел студэнцтва ў грамадзкай працы на весцы. | Фракцыя Выканбюро | „ | „ |
| | **В. Акадэмічная і гаспадарчая праца.** | | | |
| 1 | Даклад аб вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўцы ў БДУ | т. Астроўскі | Сьн. | „ і сход. |
| 2 | Аб акадэмічнай нагрузцы Рабфаку. | яч. Рабфаку і Гурло | „ | Бюро |
| 3 | Зацьверджаньне складу вылучэнцаў. | Фракцыя Праўленьня | „ | „ |
| 4 | Вызначэньне складу рэдкалегіі навуковых прац па БДУ і факультэтах. | „ | Люты | „ |
| 5 | Аб ускарэньні выпускаў па БДУ . | „ | „ | „ |
| 6 | Аб рэарганізацыі кіраўніцтва БДУ і ўвядзеньня адзінаначальля. | Фракцыя Праўленьня | „ | „ |
| 7 | Абгаварэньне кандыдатаў у кіруючыя органы БДУ у зьвязку з адзіначальлем. | т. Каранеўскі | „ | „ |
| 8 | Заслухаць даклады Дэканатаў: Правгасу, Пэдфаку, Хэмфаку і Рабфаку аб рэарганізацыі. | Фракц-Дэканатаў і Бюро ячэек | „ | „ |
| 9 | Заслухаць даклады Бюро факультэцкіх яч. аб выкананьні пастановы Бюро калект. ад 11/XI аб стане акадэм. працы на факультэтах. | Бюро яч.: Правгасу, Пэдфаку, Рабфаку. Хэмфаку | Люты і Сак. | „ |
| 10 | Заслухаць даклад фракцыі Праўленьня аб выкананьні пастаноў Бюро калектыву ад 11/XI аб стане акадэм. працы. | Фракцыя Праўленьня | „ | „ і сход |
| 11 | Таксама фракцыі Выканбюро . . . | Фракц. ВБ. | „ | „ |
| 12 | „ „ Мясцкому . . . | Фракц. МК. | „ | „ |
| 13 | Вывады становішча сац. спаборніцтва па БДУ. | Камісія | Люты | „ |
| | **Г. Кіраўніцтва грамадзкімі, прафэсійнымі і масавымі арганізацыямі.** | | | |
| 1 | Аб студ. камуне . . . . . . . . | Фракц. ВБ. | Студз. | Бюро |
| 2 | Аб рэарганізацыі прафарг. БДУ . . | Фракц. ВБ. | Люты | „ |
| 3 | Плян працы Фракцыі МК . . . . | Фракц. МК. | Студз. | „ |
| | **Д. Аб працы калектыву ЛКСМ БДУ.** | | | |
| 1 | Аб культпаходзе камсамолу. . , . | Касьцюковіч | Сакав. | „ |
| 2 | Аб становішчы і далейшых задачах работы партядра ў КСМ . . . | Голанд | Сакав. | „ |
| 3 | Становішча работы з камсамольцамі-перарösткамі. | „ | Люты | „ |
| 4 | Аб выкананьні пастановы Бюро калектыву ад 11/XI аб стане акадэм. працы. | Бюро калект. ЛКСМБ | „ | „ |

Адк. Сакратар Бюро Калектыву КП(б)Б БДУ **Эпштэйн.**

# ДЗЕ КУЛЬТКАМІСІЯ?

## Узяць пад грамадзкі кантроль скарыстоўваньне часу студэнтамі.

Ва ўмовах нашага Універсытэту, калі габінэты абстаўлены вельмі дрэнна, калі няма агульнай чытальні для студэнтаў, калі студэнт ня мае такога прыстанішча, дзе ён-бы мог сур‘ёзна займацца над папаўненьнем свайго тэарэтычнага багажу, вялікае значэньне маюць нашы інтэрнаты і ў сэнсе заняткаў і асабліва ў сэнсе спакойнага адпачынку.

Як у тых, так і ў другіх адносінах нашы інтэрнаты зусім не прыстасаваны (вялікія, мала сьвету, няма абсталяваньня). Але гэта яшчэ палова бяды. Горш абстаяць справы, калі студэнты ператвараюць інтэрнат у дыскусійны клюб ці ў прыстанішча бязьдзельнікаў. Прыкладам такога інтэрнату можа служыць інтэрнат па Савецкай 14, пак. 7-6. Зайдзі, і ты пачуеш непераcьціхаючую музыку гітары, пачуеш дыспут аб будучыне студэнтаў, рамансы на розныя тэмы, балет і ўсё, што табе ўздумаецца. І гэта з 8-мі гадзін раніцы і да 12 вечара. Як быццам няма чым займацца. Няма газэт, няма кніг „Не займацца, не адпачываць самім і не даваць другім“. Такі дэвіз нашых інтэрнатаў.

Мы пытаем, дзе-ж нашы экамом і культкамісіі Выканбюро і і Прафкому, якія павінны сачыць за бытам студэнцтва ў інтэрнаце. Трэба ўзяць пад рашучы абстрэл самакрытыкі скарыстаньне часу студэнтамі ў нашых інтэрнатах. Трэба ператварыць інтэрнаты ў кузьні калектыўнай працы і адпачынку.

**Студэнтка.**

**Адказны Рэдактар—РЭДКАЛЕ[ГІЯ]**

Друкарня БАН. Заказ № 2884. У ліку 3000 экз. Галоўлітбел 38[…]